## Эфектыўныя напрамкі вывучэння і ўкаранення беларускай мовы ў адукацыйным працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі

Каб родная мова не была экзотыкай для дзяцей і заняла пачэснае месца ў адукацыйным працэсе, патрэбнана ладзіць сістэму дзейнасці па ўжыванні, укараненню і распаўсюджанні яе ва ўстанове адукацыі. Прапануем эфектыўныя напрамкі вывучэння і ўкаранення беларускай мовы ў адукацыйным працэсе дашкольнай установы:

Правядзенне дзён беларускай мовы, заняткаў па развіцці беларускамоўных узаемаадносін ("Нацыянальнае адзенне", "Вышыўка і карункі", "Лялькі з саломы і лёну", "Вырабы з лазы (саломкі, дрэва, гліны)", "Беларуская народная цацка", "Знаёмства з прадметамі сялянскага побыту");

Арганізацыя мерапрыемстваў па знаёмству з беларускімі пісьменнікамі, іх жыццём і творчасцю, па пытанняхразвіцця беларускай мовы і літаратуры;

Правядзенне ранішнікаў, свят, тэматычных вечарын, прысвечаных творчасці беларускіх пісьменнікаў, беларускаму народнаму фальклору;

Правядзенне кніжных выстаў, дзён беларускага пісьменства з мэтай прапаганды беларускай мовы і лепшых твораў айчыннай літаратуры;

Арганізацыя наведвання бібліятэк, музеяў, экскурсій па гістарычных мясцінах беларусаў, дзе можна пазнаёміцца з асноўнымі гістарычнымі падзеямі, славутымі беларусамі – іх месцам і значэннем у гістарычным развіцці краіны (Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Міхала Агінскага і інш.), мастацтвам Беларусі, народнымі святамі, традыцыямі, звычаямі, народнымі промысламі і рамёствамі, дасягненнямі беларускага народу.

### Будзе цікавым і карысным для дзяцей дашкольнага ўзросту пазнавальны матэрыял для гульневай дзейнасці:

**Рухомыя гульні** "Садзі лянок", "Гарлачык", "Чарадзей", "Гарады", "А мы проса сеялі", "Грушка", "Пасадка бульбы", "Змейка", "Заінька ў садочку", "Шышкі, жалуды, арэхі", "Паляўнічыя і качкі".

**Дыдактычныя гульні**

**Малодшы ўзрост:** "Знайдзі прадмет па слове", "Што ў мяшэчку", "Ветлівыя словы".

**Сярэдні ўзрост**: "Магазін", "Разбяры посуд", "Адгадай, што ў мяшэчку?", "Агароднік", "Што нам прывезлі калгаснікі?", "Хто што робіць у весцы".

**Старэйшы ўзрост**: "Што з чаго і як зроблена?", "Каму што трэба", "Хто знойдзе, няхай возьме", "Што я бачыў", "Што схавана пад сурвэткай?", "Паглядзі, спазнай і назаві", "У садзе, полі, агародзе", "Гардэроб лялькі".

Нельга вывучыць родную мову пад прымусам, яна павінна ўвайсці ў сэрца і думкі дзяцей непрыкметна, лёгка. А для гэтага неабходна спалучаць разнастайныя формы работы, якія б не прымушалі дзіця «завучваць», а падштурхоўвалі да свядомага жадання запомніць новае слова, яскравы паэтычны радок, падзяліцца радасцю свайго адкрыцця з сябрамі, бацькамі.

### Формы работы педагогаў установы з бацькамі:

*Індывідуальныя формы:*

- стварэнне герба сям'і, радаводу;
- распрацоўка і падрыхтоўка касцюмаў да народных святаў;
- прыгатаванне страў беларускай кухні;
- мэтавыя прагулкі па вёсцы;
- наведванне музеяў, выстаў;
- складанне апавяданняў на розныя тэмы;
- збіранне ілюстрацый, выразак з часопісаў;
- анкетаванне бацькоў.

*Калектыўныя формы:*

- кансультацыя "Мая Радзіма-Беларусь";
- семінар-практыкум "Традыцыі беларусаў і іх асноўныя запаветы";
- лекторый "Роля бацькоў, бабуляў і дзядуляў у выхаванні сваіх нашчадкаў";
- сямейны клуб "Талака";
- гутаркі, успаміны дзядоў і бабуль пра сваё мінулае;
- круглы стол "Мудраслоўе на кожны дзень", "Як выхаваць беларуса"; лекцыя-дыялог "За талакою ўсёй сям'ёю" (аб працоўным выхаванні ў сучаснай сям'і);
- забава "За здаровы лад жыцця";
- сустрэчы са знакамітымі жанчынамі Беларусі, шматдзетнымі маці, жанчынамі года;
- вечарына "Не пусцім наш род на звод";
- конкурс "Дружна стане ў карагод наш славуты радавод";
- сумесныя народныя святы і абрады;
- гасцёўня "Любімая песня (верш, прыказка) нашай сям'і";
- вечар-партрэт "Куфэрачак сямейнага шчасця";
- вячоркі "Сення ў нашай хаце свята";
- шоў-конкурс "Вось такія пірагі!";
- стварэнне і работа міні-музеяў у групе (беларускае нацыянальнае адзенне, жывельны і раслінны свет, гістарычныя помнікі, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і інш.) ;
- інсцэнізацыя казак і паданняў;
- школа маладых бацькоў ( "Якая матка, такое і дзіцятка " – цыкл сустрэч з маладымі сем'ямі).
- Сямейны педсавет "Вопыт выхавання дзяцей".

**Каб вызначыць адметнасць педагагічнага вопыту сям'і, бацькам прапануецца анкета з пытаннямі і заданнямі:**

Ці ведае Ваша дзіця геаграфічныя назвы мясцовасці, дзе пражывае?
Зможа сын (дачка) назваць Ваша поўнае імя і імя па бацьку?
Як часта ўнук (чка) бачыцца з бабуляй і дзядулем?
Як Вы рыхтуецеся да нацыянальных святаў, якія з іх адзначае Ваша сям'я?

Якія рэцэпты (назвы) беларускіх страў перададзены Вам ад старэйшага пакалення?

Ці гулялі б Вы з дзецьмі ў народныя гульні, кааб ведалі іх змест і прыналежнасць святу (напрыклад, біткі ў Вялікдзень; гойданне на арэлях на Саракі, Гуканне вясны і інш.)?

Спадзяюся, што прапанаваныя сродкі і формы дапамогуць Вам арганізаваць цікавую і змястоўную дзейнасць у дадзеным накірунку.

Толькі агульнымі намаганнямі можна дабіцца станоўчага выніку ў далучэнні дзяцей да роднай спадчыны.

Літаратура:


1. Н.С. Старжынская, Дз.М.Дубініна “Методыка развіцця роднай мовы", Мінск,2008
2. Н.С. Старжынская, Дз.М.Дубініна “Развіццё беларускагеа маўлення дашкольнікаў", Мазыр, 2009
3. Дз.М.Дубініна, В.П.Жыхар “Мой край завецца беларуссю", Мазыр, 2004